# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат

**Аксаны Аляксандраўны Селях**

"Трансфармацыя паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20 - 80 гг. XX ст.", прадстаўленага на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук

па спецыяльнасці 07.00.07 - этнаграфія, этналогія і антрпалогія.

Рэферат дысертацыйнага даследавання, апублікаваны Аксанай Аляксандраўнай Селях, асвячае тэму, якая да цяперашняга дня знаходзілася ў ценю іншых вывучаемых этнолагамі праблем і не атрымала належнай увагі. Тэма моладзі, яе сацыялізацыі і развіцця закраналася шэрагам вядучых айчынных навукоўцаў, якія працуюць у галіне этналогіі. Аднак іх увага пераважна абмяжоўвалася вывучэннем сучасных ці зусім нядаўніх сацыяльных і культурных працэсаў, у той час, як Аксана Аляксандраўна засяроджвае ўвагу на гістарычнай перспектыве, паказваючы, як развівалася самаўсведамленне, жыццёвыя стратэгіі, сацыяльныя функцыі і культурныя ўстаноўкі вясковых дзяўчат Заходняга Палесся ў XX ст. Удалым падаецца і рашэнне саіскальніцы засяродзіцца менавіта на адной гендэрнай групе, дзяўчатах, а не на вывучэнні моладзі ў цэлым, таму што такая перспектыва дазваляе ўбачыць многія тэмы і праблемы якія знікалі ў оптыцы больш шырокіх, генералізуючых даследаванняў. Некалькі пакаленняў палесскіх дзяўчат ад да 20-х да 80-х гг. XX ст. перажылі радыкальныя сацыяльныя, культурныя і палітычныя трансфармацыі, захаваўшы праы гэтым стрыжань сваёй этнічнай культуры, свае маральныя і культурныя ўстаноўкі. Гэты досвед, сам па сабе цікавы ў навуковай перспектыве, каштоўны сёння і ў шырэйшым плане, таму што працэсы мадэрнізацыі не спыніліся і новыя пакаленні, у тым ліку беларускіх дзяўчат, стаяць перад вельмі падобнымі пытаннямі і выбарамі. Усё гэта дазваляе казаць пра актуальнасць працы як у навуковай, так і ў грамадскай перспектыве.

Метадалогія працы і стартэгія даследавання выбудаваны правільна, што ў сваю чаргу мела вынік у змястоўных, арыгінальных і абгрунтаваных высновах. Абраны аўтарам перыяд даследавання дазволіў карыстацца як архіўнымі матэрыяламі, так і ўласнымі палявымі запісамі, якія шырока прадстаўлены ў працы: галасы палесскіх жанчын, цяпер дасягнуўшых сталага веку, дазваляюць рэканструяваць тыя пласты жыцця і культуры, якія амаль не пакідаюць следа ў пісьмовых крыніцах.

На мой погляд, зробленая Аксанай Аляксандраўнай праца – гэта больш чым шараговае этналагічнае даследаванне. Многія тэмы паднятыя её упершыню апісваюцца сістэматычна ў беларускай этналагічнай навуцы: матрыманіяльныя стратэгіі, сфера інтымнага жыцця, дашлюбныя адносіны, сітуацыі падпарадкавання, якія структуравалі жыццё палескай дзяўчыны. Гэтыя тэмы да цяперашняга часу з-за пэўнай кансерватыўнасці падыходаў заставаліся не вывучанамі, а часам нават і не прамоўленымі ў навуковым дыскурсе беларускай этналогіі. У той жа час у гістарыяграфіях суседніх краін гэты тэматычны напрамак дастаткова добра развіты і распрацаваны. Такім чынам, праца саіскальніцы дазваляе кампенсаваць гэта адставанне і ў абраным ёю тэматычным напрамку паставіць беларускую этналогію ўровень з дасягненнямі навукоўцаў суседніх краін.

Падыходы, якія саіскальніца выкарыстоўвае ў працы, могуць быць паспяхова выкарыстаны і ў іншых даследаваннях у гэтым напрамку. Застаецца спадзявацца, што ў будучым, мы здолеемм прачытаць аналагічнае даследаванне, прысвечанае не толькі палескім дзяўчатам але і хлапцам, і што ўвагу даследчыкаў прыцягнуць і іншыя рэгіёны краіны. Найперш тут цікава было правесці параўнання з рэгіёнамі ўсходняй Беларусі, такімі як магілёўскае Падзвінне ці ўсходняя Віцебшчына. Было б вельмі добра, каб праца Аксаны Аляксандраўны, дапоўненая больш разгорнутымі прыкладамі і ілюстрацыямі, якія не змяшчаюцца ў дазволены для дысертацыі памер, была апублікавана. Няма сумневу, што яна была б цікава не толькі навукоўцам, але і больш шырокаму колу чытачоў.

Палажэнні, якія выносяцца на абарону, маюць навуковую навізну і адпавядаюць зместу дысертацы, заўваг да іх няма. Сама праца з'яўляецца арыгінальным і самастойным даследаваннемм, што пацвярджаецца публікацыямі аўтара ў навуковых зборніках і часопісах. Лічу, што Аксана Аляксандраўна Селях заслугоўвае прысуджэння навуковай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія.

Кандыдат гістарычных навук,
старшы навуковы супрацоўнік
аддзела нарадазнаўства
Цэнтра даследаванняў беларускай культуры,
мовы і літаратуры НАН Беларусі С.У. Грунтоў

ПОДПИСЬ С.В. Грунтова
УДОСТОВЕРЯЮ
Ведущий специалист по кадрам
Н.Д. Иошкова
«09» 06 2026 г.